**Масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК "Лунінецкая РЦБС" у жніўні**

**1 жніўня. ЦРБ.** У бібліятэцы адбылася XXXIV літаратурная праграма, прысвечаная памяці пісьменніка-земляка Мікалая Калінковіча. На пачатку мерапрыемства ўсе прысутныя прынялі ўдзел у цырымоніі ўскладання кветак да помніка Мікалаю Калінковічу ля цэнтральнай раённай бібліятэкі. Далей у актавай зале адбыўся круглы стол на тэму «Историческая память – фундамент государства». Ганаровы грамадзянін Лунінецкага раёна, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Таццяна Канапацкая выступіла ў ролі вядучай. У рабоце круглага стала прынялі ўдзел Карлюкевіч Аляксандр Мікалаевіч, дырэктар РУП Выдавецтва «Беларусь», старшыня ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі», лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (г.Мінск), Трахімёнак Сяргей Аляксандравіч, прафесар, доктар юрыдычных навук, член Саюзаў пісьменнікаў Беларусі, старшыня Камісіі па творчай спадчыне М.М. Калінковіча пры Саюзе пісьменнікаў Беларусі (г.Мінск), Стружэцкі Тадэуш Іванавіч, дзеяч культуры, педагог, уладальнік знака Міністэрства культуры «За ўклад у развіццё культуры Беларусі», Стружэцкая Людміла Георгіеўна, ветэран працы Нацыянальнай бібліятэкі РБ, Фралова Іна Мікалаеўна, спецыяліст Мінскага гарадскога адзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі і Расіі», намеснік дырэктара Пінскай цэнтральнай гарадской бібліятэкі Людміла Ігараўна Папіціч, протадыякан Андрэй Гарбуноў, кандыдат багаслоўя, лаўрэат Першага абласнога літаратурнага конкурсу «Духоўны веліч» (г.Баранавічы), пратаірэй Сергій Крышталь, благачынны Лунінецкай акругі, кандыдат багаслоўя, настаяцель храма «Спагнанне загінуўшых».

Аляксандр Карлюкевіч і Іна Фралова падарылі бібліятэцы свае кнігі. Выставу-продаж прадставіла выдавецтва «Беларусь», дзе былі прадстаўлены кніжныя навінкі ўдзельнікам і гасцям мерапрыемства. Таксама можна было пазнаёміцца з кніжнай выставай, прысвечанай жыццёваму шляху Мікалая Калінковіча і літаратурнымі творамі Аляксандра Трахімёнка, якую прадставілі работнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі.

У чытальнай зале цэнтральнай бібліятэкі для гасцей была праведзена літаратурная праграма падрыхтаваная настаўнікамі і навучэнцамі СШ №2, на якой прадставілі відэа Дыпламанта I ступені ў конкурсе «Мастацкае чытанне вершаў» XI Міжнародных Васільеўскіх чытанняў «Шлях да Вялікай Перамогі» (г.Сонечнагорск, Расія) Яўгена Рафаловіча, які чытаў любімы твор Мікалая Калінковіча «Рассказ танкиста» Аляксандра Твардоўскага.

У **цэнтральнай раённай дзіцячай бібліятэцы** Іна Мікалаеўна Фралова правяла творчую сустрэчу «Самы лепшы дзень» для выхаванцаў дзіцячых садоў №1 і №3 г. Лунінца, а таксама актыўных чытачоў бібліятэкі. Іна Мікалаеўна прэзентавала свае новыя кнігі «Залатыя рыбкі» і «Самы лепшы дзень», якія выклікалі цікавасць у дзяцей. *(Лунінецкія навіны. 2025. 6 жніўня. С.5)*

**9 жніўня. Мікашевіцкая г.б.** У рамках Дня горада была арганізавана бібліятэчная пляцоўка «Островок детства», дзе была аформлена кніжная выстава «Усе казкі ў госці да нас». Таксама была арганізавана зона адпачынку з цікавымі заданнямі і гульнямі. Правялі віктарыну «Город Строителей» і бяспройгрышную латарэю.
**14 жніўня. ЦДБ.** У рамках народнага Відэакалендара «Сонцазварот» прайшла інфармацыйна-пазнавальная сустрэча «Мядовы спас» з удзелам выхаванцаў дзіцячага садка №3 г.Лунінца.
**19 жніўня. ЦРБ і ЦДБ.** Бібліятэкі правялі акцыю «Читающий город». Мэта акцыі – папулярызацыя кнігі і чытання, знаёмства жыхароў горада з паслугамі бібліятэк. На працягу акцыі дзеці ўдзельнічалі ў займальнай віктарыне, самыя актыўныя атрымалі салодкія прызы. Для дзяцей было арганізавана месца для творчасці, дзе можна было на паперы ўвасобіць свае фантазіі. Для дарослых наведвальнікаў была арганізавана бяспройгрышная латарэя. Любы жадаючы змог узяць з сабой кнігі са свабоднага кнігаабмену, атрымаць інфармацыю аб рабоце ўстаноў і запісацца ў бібліятэкі.
**22 жніўня. ЦБ.** Адбыўся прававы ўрок «Личная безопасность». На мерапрыемства запрасілі Кіндрука Кірыла Генадзевіча, старшага оперупаўнаважанага па кіберзлачынасці.

Бібліятэкі-клубы арганізоўваюць і праводзяць **святы вёсак.** Так, **9 жніўня** бібліятэкары **Кажангарадокскай сельскай бібліятэкі-клуба** правялі свята вёскі «Сяло маё цудоўнае  на беразе ракі». **10 жніўня** бібліятэкар **Бродніцкай сельскай бібліятэкі-клуба** правяла свята вёскі «Мая родная старонка». **23 жніўня** прайшло свята ў Азярніцкай **сельскай бібліятэцы-клубе** «С любовью к малой Родине».

У жніўні ў бібліятэках раёна працягваліся мерапрыемствы з дзецьмі.
10 жніўня ў **Любанская с.б**. правялі краязнаўчую гадзіну і агляд літаратуры «Памяти земляка В.А.Степченко» з удзелам краяведа Сцяпана Нефідовіча. 11 жніўня ў Дрэбскай сельскай бібліятэцы-клубе адбылася літаратурная гадзіна «Летнее чтение – удивительное приключение».